Сёння, ў рамках праекта «Кожная пятніца — роднае сваё!», для наведвальнікаў аддзялення падтрымкі актыўнага даўгалецця ва ўмовах дзеннага знаходжання Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна адбылася паездка ў горад Мінск. Удзельнікі наведалі храмы трох канфесій — касцёл, царкву і мячэць.



Мэта мерапрыемства — не толькі знаёмства з гістарычнай і культурнай спадчынай сталіцы, але і ўмацаванне павагі да традыцый усіх народаў, якія жывуць на беларускай зямлі. Наведванне святынь розных канфесій стала нагодай яшчэ раз пераканацца: Беларусь — дом для людзей рознага веравызнання, аб'яднаных любоўю да сваёй Радзімы.







